## ІДЭАЛАГАМ — ЗНОСІНЫ БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ, ГАЗЕТЧЫКАМ — АНАЛІТЫКА І КРЫТЫКА

Ідэолагі Магілёўскай вобласці скіраваны на дастойныя зносіны з людзьмі. **Начальнік упраўлення ідэалогіі Магілёўскага аблвыканкама Валерый ІЛЬЯНКОЎ** на выніковай калегіі нагадаў: з людзьмі трэба гутарыць так, як са сваякамі — натуральна і без фармалізму.

Прыкмета часу: выкарыстанне новых інтэрактыўных формаў і інфармацыйных тэхналогій. Інтэрнэт-сайты займелі органы ўлады і рэгіянальныя выданні.

Сярод мноства кірункаў дзейнасці ідэолагі Магілёўскай вобласці галоўным прыярытэтам называюць СМІ. Там больш гэта важна ў год выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, святкавання 65-годдзя Перамогі і іншых значных падзей у краіне.

— Некаторыя выданні заселі ў мінулым стагоддзі: ады бравурныя справаздачы і нарматыўныя дакументы, — крытыкавалі газеты ідэолагі.

На калегіі журналістаў заклікалі пісаць рэгіянальную аналітыку, каб зацікавіць сваіх чытачоў: сёння супернічаць з радыё і тэлебачаннем у аператыўным інфармаванні людзей друкаваным СМІ не выпадае. Але менавіта аналітычныя артыкулы і справядлівая крытыка, на думку ідэолагаў, дазволяць прыцягнуць людзей да жывога абмеркавання праблем, якія сёння хвалююць грамадства.

Напрыклад, на старонкі газет прапанавана вынесці палеміку па праблеме роднай мовы. Валерый Ільянкоў звярнуў увагу ідэолагаў на пашырэнне ўжытку беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця, у сувязі з выкананнем рэгіянальнага комплексу мераў па прапагандзе роднай мовы на 2010—2012 гады.

Паводле сацыялагічнага апытання ў Магілёўскай вобласці, больш за 60 % апытаных лічаць сябе людзьмі сярэдняга дастатку, а гэта — знак стабільнасці грамадства. Валерый Ільянкоў нагадаў, што якасць жыцця людзей — гэта канчатковая мэта працы і ідэолагаў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## НЕ СПРАВІЎСЯ З КІРАВАННЕМ

На аўтадарозе Баранавічы—Ляхавічы жыхар в. Дарава-Чыж не справіўся з кіраваннем і яго аўтамашына «Форд-Эскорт» выехала на паласу сустрэчнага руху і сутыкнулася з «Опель-Астра». У выніку аварыі вадзіцель «Форда» і пасажыр загінулі на месцы, а пасажырку «Опеля» даставілі ў бальніцу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## НОЖ З ПРЫЛАЎКА

схапіў у стане алкагольнага ап'янення 27-гадовы гамяльчанін, калі зайшоў у харчовую краму. Сярод белага дня ён пагражаў супрацоўнікам крамы фізічнай расправай і параніў руку сталаму грамадзяніну, які паспрабаваў яго супакоіць. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, дэбашыра затрымала міліцыя.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# І КІРАЎНІК, І ФУТБАЛІСТ, І НА ЛЫЖКАХ ГУЛЕЦ

**Вядомую прымаўку, адаптаваную пад мясцовы каларыт, цяпер можна аднесці не да аднаго чыноўніка органу дзяржаўнага кіравання, а да тысяч. Менавіта столькі прадстаўнікоў ад вертыкалі ўлады ўзялі ўдзел у спартакіядзе і конкурсе аматарскай творчасці сярод работнікаў выканкамаў і структурных падраздзяленняў Гомельскага аблвыканкама.**



Вакальна-інструментальны ансамбль кіраўнікоў Буда-Кашалёўскага раёна.

Спартыўныя спаборніцтвы пачаліся з традыцыйнай лыжні, а потым перайшлі на розныя спартыўныя пляцоўкі Гомеля. У першынстве па більярдзе першым стаў кіраўнік адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля Сяргей Краўцоў, а намеснік старшыні аблвыканкама Пётр Кірычэнка — сярод лідараў у стральбе з пнеўматычнага пісталета. Між тым, у спартыўных спаборніцтвах камандныя вынікі не падводзіліся. Вырашана было, што ўсё ж галоўнае — удзел, а не перамога.

Тры дні спецыялісты ў галіне кіравання ў футбол-валейбол-тэніс-шахматы гулялі, па мішэнях стралялі, дроцікі прыцэльна кідалі, а таксама спявалі, у танцы скакалі, вершы чыталі, і нават на лыжках ігралі. Больш за тое, сёлета высветлілася, што і жартаваць могуць добра — зала прыйшла ў захапленне, калі пабачыла «Джэнтльмен-шоу» з Акцябрскага раёна, у якім тон задавалі мясцовыя кіраўнікі. Не менш спадабалася праграма «Зорны дождж у Аўцюках», прывезеная з радзімы беларускага гумару — Калінкавіцкага раёна.

Прынамсі, прыклад кіраўнікі структурных падраздзяленняў падавалі паўсюль. Упершыню за 11 гадоў правядзення мерапрыемства журы адзначала такую актыўнасць лідараў райвыканкамаў і раёнаў Гомеля — 14 з 25 асабіста былі на сцэне або на спартыўных пляцоўках.

Буда-Кашалёўскі раён стаў пераможцам у намінацыі «Лепшы вакальна-інструментальны ансамбль». Іх мужчынскі калектыў (старшыня райвыканкама Аляксандр Грыгарэнка і яго намеснікі) выканаў песню з рэпертуару Аляксандра Буйнова *(фота)*. Аляксандр Капыткоў, кіраўнік самага паўднёвага раёна Беларусі — Лельчыцкага — прызнаны лепшым спеваком сярод прадстаўнікоў вертыкалі ўлады Гомельскай вобласці.

У мастацкай творчасці намінацый хапіла, каб вызначыць лепшых сярод тэатральна-музычных кампазіцый, саліста-вакалістаў, дэкламатараў, харавых і харэаграфічных калектываў, вакальных і вакальна-інструментальных ансамбляў... Ну а тым, хто аддае перавагу вышыванню, вязанню або калекцыянаванню, таксама было дзе прадэманстраваць свае ўменні. На конкурсе цікавай і незвычайнай прызнана калекцыя фуражак, прывезеная з Мазырскага раёна. «Танец з манекенамі», які прадэманстравалі гледачам прадстаўнікі чыноўніцтва Рагачоўшчыны, вызначыў камандную перамогу гэтага раёна вобласці.

Тры дні спаборніцтваў сталі для кіраўнікоў розных узроўняў Гомельскай вобласці своеасаблівым трэнінгам стасункаў, суперніцтва і, безумоўна, сяброўства.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ГОША І ГЕРА ХОЛАДУ НЕ БАЯЦЦА

Афрыканскія страусы па мянушцы Гоша і Гера трэці год з'яўляюцца сталымі насельнікамі гасціннага падворка на 151-м кіламетры Мінск — Віцебск. Цікава, як гэтыя носьбіты афрыканскіх генаў (нягледзячы на тое, што яны інкубатарныя) пераносяць беларускую зіму? Работнік прыдарожнага аўтапаркінга **Уладзімір КАСЦЮКОВІЧ**, падстаўляючы птушкам скрыначку з кармавой сумессю (на фотаздымку), паведаміў, што нават 25-градусныя маразы птушкі перанеслі без праблем. На пачатку зімы, калі маразы былі зусім слабыя, паўднёвыя істоты нават пашчыпвалі траву з-пад снегу, а Гера несла яйкі. Цяпер жа трэба чакаць вясны, каб гурманы маглі пасмакаваць страусавую яешню.



Фота Анатоля Клешчука.

## Дзяўчынка і печка

Пажар адбыўся 5 лютага ў вёсцы Шамаўшчына Мсціслаўскага раёна. Бацькі пайшлі на працу і пакінулі 9-гадовую дачку адну ў хаце. Яна самастойна паліла печку: адкрыла топку, каб падкласці дроў, нахілілася, і ў твар ёй ударыла полымя. Бедная малая моцна спужалася і пабегла да сваёй бабулі. Адтуль яе забрала брыгада хуткай медыцынскай дапамогі: цяпер дзяўчынка ў бальніцы, у яе апёкі твару 1-2-й ступені.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, у выніку пажару ў доме знішчана частка маёмасці, сама будыніна моцна не пацярпела. Прычына здарэння — парушэнне правілаў эксплуатацыі печкі.

**Ілона ІВАНОВА.**

Кінавандроўка



# ШТО ПАСЛЯ «МАСАКРЫ» ЗАСТАЛОСЯ?

*У Жалудоцкім палацы графа Чацвярцінскага па заканчэнні здымак пабывалі карэспандэнты «Звязды»*

**НАША ДАВЕДКА:**
**«Масакра» — першы беларускі фільм жахаў (містычны трылер), што займеў ад рэжысёра-пастаноўшчыка Андрэя Кудзіненкі новы назоў жанру — «бульба-харар». Містычныя падзеі фільма развіваюцца ў XIX стагоддзі падчас паўстання Кастуся Каліноўскага. Бюджэт фільма — 1,78 мільёна долараў. «Масакра» займела папулярнасць яшчэ да пачатку здымак самой карціны.**

**ЗДЫМКІ першага беларускага фільма жахаў «Масакра», што працягваліся 4 месяцы, да радасці кінаманаў скончыліся яшчэ напрыканцы снежня мінулага года. Але ж усе аздабленні Жалудоцкага палаца, у якім і адбываліся здымкі, яшчэ пэўны час знаходзіліся ўсярэдзіне памяшкання. Што ж хавае гісторыя «Масакры» і што ўбачым на экране? Менавіта гэта мы і вырашылі высветліць...**

Да Жалудка мы дабраліся чыгункай, спярша спрабуючы спаць у начным цягніку «Масква—Гродна», а потым услухоўваючыся ў абвесткі машыніста ў электрычцы «Ліда—Гродна»... Нарэшце, мы на чыгуначнай станцыі «Жалудок». Літаральна па калена ў снезе. Як потым нам распавядуць мясцовыя жыхары, пра паўстанак зусім забыліся: падыходы да станцыі не чысцяць... І вось, прайшоўшы, прадзёўбваючы снег, бадай, з кіламетр, мы выйшлі нарэшце на чыстую дарогу — наперадзе ехаў трактар, даючы дарогу такім, як мы. Праз сем кіламетраў снежна-чыстага шляху мы апынуліся ў Жалудку...

Што ёсць для мясцовых жыхароў тамашні палац і леташнія здымкі «Масакры»? Гэта, найперш, сапраўднае свята! Бо гэта быў жывы тэатр, дзе можна было не толькі прасачыць, як працуюць акцёры, як здымаюць фільмы, але і паўдзельнічаць у гэтым працэсе: некалькі жалудчукоў ігралі нават не самыя апошнія ролі ў будучым фільме. У дадатак жыхары спадзяюцца, што Жалудок стане беларускай пляцоўкай гістарычнага кіно і ў мястэчка пацягнуцца і іншыя здымаць сюжэты XIX стагоддзя. Гэта, дарэчы, ужо і цяпер спраўджваецца, бо ў хуткім часе тут маюць пачацца новыя кінапрацы — на гэты раз з удзелам расійскіх пастаноўшчыкаў.

**НЕЗАЛІК!**
**Ставім мы мясцоваму кіраўніцтву за добраўпарадкаванне чыгуначнай станцыі «Жалудок». Не пачышчаныя падыходы да навакольных населеных пунктаў могуць адпудзіць некаторых турыстаў. Прычым здзівіла тое, што на самой станцыі ў нармальным стане стаіць закінуты паўстанак, збудаваны яшчэ за польскімі часамі, а таму ніякіх цяжкасцяў узнавіць ягоную дзейнасць альбо зрабіць там мясцовую краму, на наш погляд, няма.**

...І вось мы стаім перад велізарнымі драўлянымі зачыненымі дзвярыма: недзе недалёка брэша сабака-вартаўнік, пад нагамі снег, а наперадзе трэшавы выгляд хараўскага памяшкання:

— Замок ёсць ці не? А не, дык палезеце праз акно, — **раіць нам наш праваднік спадар Леанід.** — А-а-а, не пашанцавала! А мо тут ёсць і падземны ўваход...

Праблукаўшы некалькі хвілін вакол палаца, мы вырашылі, што найлепшым варыянтам будзе... увайсці праз парадны ўваход. На шчасце, ланцуг злёгку саскочыў з жалезнай ручкі... Аўтэнтычная кафля і мадэрновая лесвіца, саламяная ў поўны рост фігура жанчыны і сляды крыві на другім паверсе — усё гэта нас яшчэ чакала наперадзе.

— Сюды прыязджала ўнучка графа Чацвярцінскага: яна хацела зрабіць тут дзіцячы інтэрнат — нават грошы выдзяляла пад гэта. Але ж чамусьці ёй адмовілі з гэтым, — **працягвае распавядаць нам спадар Леанід.** — Цяпер жа, хто хоча, можа ўзяць сабе гэты палац за адну мінімалку, але з умовай, што ён давядзе яго да ладу: ну, зробіць капітальны рамонт, будзе мэтанакіравана выкарыстоўваць... Вось, прыязджаў тут адзін ды хацеў увогуле палац набыць ва ўласнасць: зрабіць рэстаран, більярд — але зноўку чамусьці нічога не атрымалася...

Жалудоцкі палац мае не толькі незвычайны для беларускіх палацава-сядзібавых пабудоў вонкавы выгляд, але і арыгінальны ўнутраны, дзе шляхецкая грацыёзнасць сумяшчаецца з гаспадарнасцю, а заблытанае размяшчэнне пакояў рабіла з палаца, як ніякі іншы, падыходны аб'ект для здымак «Масакры».

На першым паверсе акрамя аўтэнтычнай кафлі пад нагамі мы пабачылі яшчэ і саламяную куклу жанчыны (салома, як прызналіся самі стваральнікі першага бульбахорара, гэта беларускае золата), якая нібы прагульваецца па лесвіцы ўніз і ўверх, а таксама розныя тэхнічныя прыстасаванні, якія выкарыстоўваліся для стварэння адпаведнага духу часу. Напрыклад, адразу стала зразумела, якім чынам з'явілася ляпніна, што абавязкова аздабляла палац у пакоях, дзе праходзілі здымкі фільма. Сакрэт, аказалася, просты: яна робіцца з пенапласту, а затым прыклейваецца да сцяны. Яны, дарэчы, таксама былі зменены: дакладней, пафарбаваныя ў шэры колер. А зверху на нас глядзелі «гаплікі» для дэкаратыўных свяцільнікаў XIX стагоддзя...

**МЯСЦОВЫ КРЭАТЫЎ**
**Як нам стала вядома ад тутэйшых жыхароў, якраз каля палаца Чацвярцінскіх знаходзіцца цудоўная прыватная сажалка з рыбай (найчасцей, карпам). Там вы маеце магчымасць парыбаліць і... заплаціць гаспадару сажалкі за злоўленую рыбу. Гэтае задавальненне вам абыдзецца ў 7 тысяч за кілаграм з магчымасцю выбару пэўнай часткі рыбы, каб набраць па грошах, калі вы злавілі гіганта. Вось такі прадпрымальніцкі крэатыў! Карацей, прыязджайце ў Жалудок — тут і палац з касцёлам, і адпачынак ля возера.**



Калі ж мы падняліся на другі паверх па старадаўняй лесвіцы, з жалем заўважылі, што не толькі яна замярзае, пакрыўшыся тоўстым слоем лёду (здаецца, не шмат ёй засталося), але і ўвесь другі і трэці паверхі. Апошні дык увогуле ператварыўся ў змерзлае каралеўства, дзе пад нагамі таўшчэзны слой снегу, ад сценаў пры любым фізічным уздзеянні адколваецца кавалак шпаклёўкі, а са столі ўвогуле не перапыняючыся, падаюць, нібы снег, тонкія і працяглыя кавалачкі змерзлай пары... На другім паверсе быў яшчэ і цікавы чырвоны пакой з саламяным аздабленнем, якое, як нам падалося, служыць абазначэннем месца для карцінаў і ў фільме, магчыма, будзе свяціцца, як золата, на якое ўпаў прамень ад лучыны.

Ледзь не згубіўшыся ў палацавых катакомбах, мы выходзілі з жалудоцкага палаца Чацвярцінскіх з надзеяй на адраджэнне не толькі самога палаца, але і беларускага кіно — і першы беларускі фільм жахаў, як нам падалося, ёсць добрым сімвалам гэтага!

**Мікола ТАМАШЭВІЧ.**
**Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.**

Ведай сваіх!

# Вядомы «Партрэт невядомай»

**Учора наша краіна, наша грамадскасць адзначала двухсотгоддзе з дня нараджэння Івана Хруцкага, вядомага беларускага мастака, імя якога ўнесена ў піс культурнай спадчыны ЮНЭСКА.**

Урачыстасці з нагоды распачаліся ў круглай зале сталічнага паштамта прэзентацыяй і спецыяльным гашэннем паштовага блока, які, па меркаванні дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова, будзе добрым падарункам беларускім і замежным філатэлістам, паспрыяе прапагандзе нашай багатай культурнай спадчыны. Гэта



Фота Марыны Бегунковай.



**Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, начальнік аддзела паштовай сувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Алег СУБОЦІН, дырэктар выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта» Ірына ШЫПІЛАВА, першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Генадзь Дзям'яненка падчас урачыстай прэзентацыі паштовага блока і сам блок «200 гадоў з дня нараджэння І.Ф. Хруцкага».**

не выклікае ніякіх сумненняў, бо паштовыя маркі, канверты, прысвечаныя юбілейнай даце з дня нараджэння слыннага мастака, безумоўна ж, разыдуцца па ўсім свеце. Да таго ж для афармлення паштовага блока мастакі Аксана Сузько і Іван Лукін абралі ці не самыя агульнавядомыя, а таму — лёгка пазнавальныя творы Івана Хруцкага: «Партрэт невядомай», «Аўтапартрэт», «Бітая дзічына, агародніна і грыбы»...

Трэба адзначыць, што гэта — далёка не першы сумесны праект Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Нацыянальнага мастацкага музея краіны. Раней у абарачэнне былі выпушчаны паштовыя блокі, прысвечаныя іконе XVI стагоддзя «Багародзіца Адзігітрыя Смаленская», слынным землякам Напалеону Орду, Язэпу Драздовічу, Міхасю Савіцкаму...

Што датычыцца Івана Хруцкага, то, па словах спадара Пракапцова, у дзень 200-годдзя з дня яго нараджэння ў музеі адкрыецца экспазіцыя твораў (яго, а таксама яго праўнучкі Ядзвігі Мацеўскай), прэзентацыя срэбнай манеты з выявай мастака і знакамітым «Партрэтам невядомай». На працягу года плануецца правядзенне міжнароднага пленэру, адкрыццё помніка-бюста, імя Івана Хруцкага будзе прысвоена мастацкай школе ў Полацку, вуліцы ў Мінску, шэраг іншых мерапрыемстваў пройдзе на роднай Віцебшчыне і далёка за межамі. Прынамсі, ёсць дамоўленасць, што работы нашага земляка будуць выстаўлены ў штаб-кватэры ЮНЭСКА і знакамітым Луўры.

**Валянціна ДОЎНАР.**

Падрабязнасці

# ПЛЫВЕ РЫБА ДА ПАЛОНКІ

**СЁЛЕТА зіма для рыбы выдалася вельмі цяжкай. Працяглыя маразы, тоўсты лёд і занесеныя снегам вадаёмы прывялі да замору.**

Але не трэба думаць, што калі пад лёдам задыхаецца рыба, то гэта надзвычайная з'ява. Дастаткова азірнуцца гадоў на 40—50 таму, каб адзначыць, што ў суровыя і снежныя зімы пачыналася самая актыўная рыбалка ў вёсцы.

У тыя часы прасекчы ў вадаёме палонку, паставіць на рэчцы нерат не лічылася браканьерствам. Але прыродзе шкода наносілася, бо ў вузкіх і плыткіх месцах рэчка перагароджвалася матамі з чароту, пучкамі лазы. Рабілася гэта ў час марозу, і нераты правяраліся раз у дзень ці праз суткі. У нас хадзілі па рыбу на Шчару, за два кіламетры. Калі ў нерат ускоквала некалькі шчупакоў, то за рыбу іх не лічылі. І такое здаралася даволі часта. Бывала мароз закуе раку, а праз некалькі дзён адпусціць і на гэтым рыбалка заканчвалася. А вось калі мароз стаяў некалькі тыдняў, а лёд быў пакрыты снегам, то гэта гарантавала ўдачу.

А напярэдадні адлігі рыба пачынала рухацца, ці як казалі, «цыркаць». Першай не вытрымлівала плотка, за ёй ішоў шчупак, а калі тэмпература паветра падымалася да нуля, то ў нерат мог трапіць і рак — рыба ішла касяком. Гэтая дзея працягвалася нейкую гадзіну ці магла расцягнуцца на больш, але калі ў нерат залазіў лінь, то казалі: «Пайшоў лінь — рыбу кінь». Лінь — моцная рыба, але карась, на мой погляд, больш трывалы — у нерат не лез.

Падлеткам, калі зіма спрыяла, я разам з аднавяскоўцамі паліў вогнішча на стажарышчах пры Шчары і разам з іншымі чакаў, калі нехта выгукне з цемры ночы магічныя словы: «Рыба пайшла!» І тады ўсе кідаліся да сваіх нератаў.

Цяжка прыгадаць, колькі той рыбы ўдавалася налавіць, але не так і шмат, можа кілаграмаў з дваццаць — драўляныя начоўкі. А самай вялікай рыбінай быў шчупак у 2 кг. Праўда, я яго з чужога нерата выцягнуў. Такое ў тыя часы бывала, бо суткамі на рэчцы сядзець не будзеш, а хто першы прыйшоў, той і гаспадар. Здаралася, што і нераты выкрадалі.



Я не з тых, хто наракае на сённяшні дзень і кажа, што некалі лепш было. Чалавеку жылося горш, але рыбы хапала. Кашом можна было налавіць у нейкім ручайку ці лужыне. І ў тыя часы ніхто чапляў не страляў і сеткі ў рыбакоў не забіраў. Таптуха была ў кожным двары. Хутчэй за ўсё, карэкціроўку зрабіла меліярацыя. Зніклі шматлікія балотцы і лужынкі, рыбаводства было пастаўлена на прамысловую аснову.

Сёння такая рыбалка ўжо немагчымая, бо ўсе вадаёмы пад кантролем дзяржінспекцыі. І хоць вышэйапісаным (спрадвечным) спосабам рыбу не ловяць, але ж рыба ідзе. Сёлетняй зімой гэты ход прыпаў на 28—29 студзеня, калі пасля працяглых маразоў наступіла адліга.

Напэўна, пра гэта ведалі многія, бо рыбакі (ды і не толькі яны), кінуліся на вадаём «Атлант», які ўтварыўся на месцы торфараспрацовак пад Баранавічамі, і пачалі высякаць і выпілоўваць бензапіламі ў лёдзе палонкі. Вадаём займае каля 500 гектараў, таму развярнуцца народу было дзе.

Рыба шукае кісларод, плыве да палонкі, каб ухапіць паветра. Вось і хапалі яе амаль што рукамі. Калі нехта быў больш спрытным, то ўлоў у яго пацягнуў на дзясяткі кілаграмаў.

Тут да работы і падключылася Слонімская міжрайінспекцыя, бо рыбак можа вылавіць толькі 5 кг рыбы ў суткі. На некалькі дзясяткаў чалавек былі складзены пратаколы.

Палонка з адкрытай вадой — бадай што адзіны спосаб дапамагчы рыбе ў гэты зімовы перыяд. І хоць людзі высякалі тыя палонкі не дзеля выратавання шчупакоў і карпаў, тым не меней спрыялі насычэнню вады кіслародам.

Вадаёмы са стаячай вадой у такую зіму, як сёлетняя, ператвараюцца ў пастку для рыбы, шанцу на выжыванне ў якой мала. То можа трэба было падысці да справы прадумана: вывесці людзей на вадаём і прабіць некалькі сотняў палонак-аддушын, а за работу няхай бы людзі вылавілі сабе па некалькі кілаграмаў рыбы. Толькі найлепш было б прабіваць палонкі яшчэ марозам, а не чакаць, калі рыба ад задухі будзе сама выскокваць на лёд.

Я папрасіў пракаментаваць сітуацыю з зімовым заморам рыбы **Аляксандра САСНОЎСКАГА, інжынера лясной гаспадаркі (Воранаўскі раён)**, з якім пазнаёміўся праз яго шматлікія публікацыі.

— У заморах нічога надзвычайнага няма. Давайце паглядзім, колькі гадоў іх не было — цяжка ўспомніць, калі так моцна замярзалі вадаёмы. Прырода скідвае празмерную нагрузку, і рыбныя запасы хутка папаўняюцца. Прырода абнаўляецца.

***— Аляксандр Васільевіч, але ж не ва ўсіх вадаёмах тае рыбы навалам, і, напэўна, нейкі працэнт трэба было б захаваць. А то застанёмся з карасямі.***

— Карась выжыве. З усёй рыбы карась самы хітры, бо ён, можна сказаць, «ачалавечаны» — эвалюцыянаваў побач з чалавекам. У маёй сажалцы карасёў шмат, але калі злавіў пару вялікіх, то больш ніводзін не клюне, а драбната хапае прынаду. Барацьбу з задухай весці вельмі складана. Вось у мяне ўсю зіму працавалі кампрэсары — гналі паветра пад лёд, а ўсе карпы загінулі. Калі паверхня вады вызвалена ад лёду, то для рыбы гэта добра. Але ж у 10—15 градусаў марозу вада хутка зацягваецца лёдам, а стаяць над палонкамі круглыя суткі — няўдзячная справа. Сам я не прымяняў, але ведаю, што ў ваду можна дадаваць перакіс вадароду і тым самым насычаць ваду кіслародам. Але бяда не ў гэтых заморах, якія былі заўсёды, — прырода вызваляецца ад стомы. Магчыма, і нам неабходна пазбаўляцца ад стомленасці — цаніць кожнае імгненне.

А зараз вернемся да вадаёма «Атлант», які не меў гаспадара, бо ў 2007 годзе райвыканкам ануляваў дагавор з паляўніча-рыбалоўнай гаспадаркай. Дырэктар мясцовага аб'яднання Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Алег Гейлаш упэўнены, што на вадаёме замору не было б, калі б ён належаў яго арганізацыі.

Дэпутаты райсавета тут жа адрэагавалі і на пазачарговай сесіі прынялі рашэнне аб передачы вадаёма таварыству БАПР. І правільна зрабілі — няхай новы гаспадар за ўсё адказвае.

У Баранавічах побач з мікраранам «Тэкстыльны пасёлак» знаходзіцца возера Жлобінскае. У нядзелю пайшоў паглядзець, якая там сітуацыя. Па перыметры, бліжэй да зараснікаў чароту, пяць рыбакоў гарбаціліся над лункамі. Памераў таўшчыню лёду — 12—15 см. На пытанне, ці задыхнулася рыба на Жлобінскім цяжка адказаць. У параўнанні з торфакар'ерам тут значна большая глыбіня. Калі вяртаўся назад праз чарот, то пад нагамі хлюпала вада, а гэта сведчанне таго, што дзесьці ёсць аддушыны.

А дзе паветра — там жыццё.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## ГІБЕЛЬ РЫБЫ ПАКУЛЬ НЕ ФІКСУЕЦЦА

**ЯК мы ўжо паведамлялі, на большасці рыбалоўных угоддзяў з-за складаных умоў надвор'я ўзнікла пагроза замораў рыбы. Пакуль, на шчасце, яе гібелі не зафіксавана, удакладнілі нашай рэдакцыі ў Мінпрыроды.**

Згодна са складзеным графікам, абследавана 213 рыбалоўных угоддзяў агульнай плошчай больш за 13 тысяч гектараў, 3,4 тысячы кіламетраў рэк, узята амаль 400 пробаў вады. Пра кар'ер Руднікі ў Брэсцкай вобласці, кар'ер Разлівы ў Гродзенскай, усе рыбалоўныя ўгоддзі Гомельскай вобласці, дзе рыбаловам-аматарам дазволена лавіць рыбу без захавання прамысловай меры і нормы вылаву, мы пісалі. Да гэтага спісу трэба яшчэ дадаць азёры Мёртвае і Туша ў Гродзенскай, раку Палозу і вадасховішча Гарэніцкае ў Мінскай, азёры Крывое, Брошка, Любонічы, Валасовічы ў Магілёўскай абласцях. «Чыстай» пакуль застаецца толькі Віцебская вобласць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## САМ ВЫБРАЎСЯ З-ПАД ЛЁДУ

76-гадовы аматар падлёднай лоўлі ледзь не стаў ахвярай свайго захаплення. У затоцы ракі Прыпяць ён праваліўся пад лёд, пасля чаго змог самастойна выбрацца з вады і паведаміць аб здарэнні па мабільным тэлефоне знаёмаму, які ў сваю чаргу паклікаў на дапамогу выратавальнікаў. Іх сталы мужчына чакаць не стаў. Яго тэлефон не вытрымаў купання ў ледзяной вадзе, на дапамогу мужчына не разлічваў, таму пайшоў у бок вёскі Клінск Калінкавіцкага раёна. Акалічнасці здарэння сталі вядомымі пасля таго, як амаль праз чатыры гадзіны мокрага рыбака знайшлі ў лесе і даставілі да месца жыхарства. Ад шпіталізацыі грамадзянін адмовіўся.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**